# Афіцыйная хроніка. Перамовы Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Сяргея Папкова з Міністрам аховы навакольнага асяроддзя і рэгіянальнага развіцця Латвійскай Рэспублікі Каспарсам Герхардсам

У ходзе перамоў Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь **Сяргей Папкоў** адзначыў: «У рамках выставы «**ТІБО-2017**» мы ўжо атрымалі некалькі прапаноў аб супрацоўніцтве з сусветнымі брэндамі, і гэты момант будзе разглядацца ў нацыянальных інтарэсах. У першую чаргу гэта датычыцца пытанняў нацыянальнай бяспекі і аховы інфармайцыі».

**Каспарс Герхардс**, Міністр аховы навакольнага асяроддзя і рэгіянальнага развіцця Латвійскай Рэспублікі, адзначыў высокі ўзровень адносін з беларускімі калегамі. «У нас шмат агульных інтарэсаў, і выкарыстанне беларускага патэнцыяла для дасягнення сумесных мэтаў выгадна для абедзвюх краін», адзначыў Каспарс Герхардс.

У рамках перамоў былі дасягнуты пагадненні аб супрацоўніцтве ў сферы развіцця ІКТ. Рэалізацыя пагадненняў запланавана на бліжэйшы час.

**Фота Прэс-цэнтра выставы «ТІБО-2017»**

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/21-04-2017-1894*